# ТОПАС І ПРАКСІС ІНТЭЛЕКТУАЛА Ў БЕЛАРУСІ: ПОШУКІ СВАЙГО МЕСЦА Ў КУЛЬТУРЫ І СОЦЫУМЕ

## Агляд публічнай дыскусіі

Дыскусія, якая ладзілася ў часе прэзентацыі праграмы навучання Лятучага універсітэта (http://fly-uni.org) на новы навучальны год, была прысвечаная ўжо досыць традыцыйнай для мясцовай інтэлектуальнай прасторы дыскусіі пра ролю і месца інтэлектуала ў сённяшняй Беларусі. У мерапрыемстве, мадэраваў якое Андрэй Ягораў, прымалі ўдзел тыя, хто паспрабаваў ацаніць актуальнае месца і спосабы самавыяўлення беларускага інтэлектуала, вызначаючы перадусім сябе ў азначаным статусе і прымаючы агучаныя дыягназы таксама і на свой конт.

Першым агучыў уласную пазіцыю метадолаг і грамадскі дзеяч Уладзімір Мацкевіч з Агенцыі гуманітарных тэхналогіяў, які адзначыў, што не варта разважаць пра беларускага інтэлектуала наогул, але трэба разбірацца з канкрэтнымі выпадкамі дзейнасці паасобных інтэлектуалаў, чый статус быў падцверджаны перадусім іхнай прадуктыўнай дзейнасцю: напрыклад, укладальніка *Найноўшага філасофскага слоўніка* Аляксандра Грыцанава альбо заснавальніка Эўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта Анатоля Міхайлава. Іхны асабісты прыклад і досвед, на думку Мацкевіча, можа быць карысным для высвятлення шляхоў і спосабаў паўставання асобы інтэлектуала ў найноўшай гісторыі Беларусі і вызначэння ягонага месца ў культуры. Інтэлектуал, на ягоную думку, паўстае перадусім насуперак «ідыятызму сялянскага жыцця» (паводле марксавай метафары наконт жыццёвага выбару Л. Фоербаха), што зацягвае мысляра ў багну паўсядзённай і банальнай сапраўднасці. «Ніхто, – паводле словаў У. Мацкевіча, – не клапоціцца пра тое, каб тут, у Мінску, у Беларусі наогул было створана асяроддзе, былі ўмовы для жыцця філосафаў, інтэлектуалаў, і ніхто не паклапоціцца апроч саміх інтэлектуалаў!. Таму інтэлектуал мусіць сам адваёўваць сабе месца і знаходзіць уласныя шляхі дзейнасці, не ўваліўшыся ў канфармізм ці нерэалізаванасць, да якіх падахвочвае «ідыятызм жыцця».

Наступны выступоўца, дырэктар інстытута «Палітычная сфера» Андрэй Казакевіч адзначыў, што для яго праблема інтэлектуалаў у Беларусі тычыцца не толькі адсутнасці адпаведнага асяроддзя, але датычыць саміх інтэлектуалаў. Сучасны беларускі інтэлектуал хворы на тры сіндромы: 1) сіндром выкладчыка (транслятар ідэяў без веры ў сказанае); 2) сіндром тэхнолага (правадыр пэўных палітычных тэхна-

логіяў, прагматычных схемаў); 3) сіндром фантаста (летуценнік, ініцыятар утапічных пражэктаў). Лекамі ад гэтай інтэлектуальнай хваробы, на думку выступоўцы, можа стацца сур'ёзнае стаўленне да зместу сваёй дзейнасці ў крытычнай масы беларускіх інтэлектуалаў, што мусіць змяніць агульную парадыгму «безадказнасці» за ўласныя думкі і ўчынкі як *modus vivendi* інтэлектуала сёння. Пры гэтым ягоная тэза наконт крытычнай масы інтэлектуалаў спарадзіла стыхійную дыскусію наконт «штучнасці», альбо ўнікальнасці асобы інтэлектуала насуперак магчымасці ягонай тыпізацыі, генералізацыі: інтэлектуал як апрычоная фігура альбо член інтэлектуальнай супольнасці.

Філосаф, выкладчык БДУ Аляксандр Сарна давёў сваю пазіцыю, што інтэлектуал перадусім як чалавек публічны павінен існаваць у пэўным напружанні: з аднаго боку, ён мусіць прамаўляць штосьці сваё, нейкія арыгінальныя думкі, з іншага ж боку, гэтыя думкі не павінныя супярэчыць ягонаму атачэнню, то бок інтэлектуал мусіць быць голасам пэўнай супольнасці, яе прамоўцам. Апрача таго, Сарна пагадзіўся з папярэднім выказваннем наконт місіі інтэлектуала – дзейнічаць насуперак ідыятызму навакольнага жыцця, падцверджаннем чаго стаецца асэнсаванне ўласнага самавызначэння філосафа ў сістэме БДУ, маўляў таго «бюракратычнага монстра», якога інтэлектуалы мусяць падганяць сваім «стыласам», каб не даць згаснуць аднаму з апошніх асяродкаў свайго існавання ў Беларусі.

Філосаф, адзін з каардынатараў супольнасці «Беларуская філасофская прастора» Павел Баркоўскі паспрабаваў тэарэтычным чынам тыпалагізаваць пераважныя рысы сучаснага беларускага інтэлектуала на аснове назіранняў за тэкстамі і публічнымі выступамі тых, хто прэтэндуе на дадзенае азначэнне ў мясцовым кантэксце. Сярод галоўных рысаў ён пералічыў наступныя: 1) атапічнасць (самаадчуванне інтэлектуала як пазбаўленага супольнасці – адсутнасць месца для прамаўлення); 2) утапічнасць (прэтэнзія на тое, што нейкая будучая «ідэальная» супольнасць вырашыць ўсе праблемы самавызначэння мясцовага інтэлектуала); 3) кантэкстнасць (насуперак ранейшаму агістарычнаму ўніверсалізму – выказванне інтэлектуаламі сваіх ідэяў у прывязцы да аналізу мясцовых праблем і сітуацыяў); 4) трагічнасць (адчуванне мясцовым інтэлектуалам віны за стан грамадскіх праблемаў, а таксама комплекс правінцыйнасці, якія разам спрычыняюць трагічнае светаўспрыйманне і апакаліптычны настрой здумлення); 5) абмежаваная публічнасць (супярэчнасць памкнення да публічнасці і «партызанскай псіхалогіі» беларускага інтэлектуала – як ваганне на мяжы паміж вастрынёй выказвання наконт грамадскіх праблемаў і бяспечнасцю). Пры гэтым выказваецца думка, што насамрэч сітуацыя з наяўнасцю асяроддзя, ці публічных месцаў для выказвання ў інтэлектуалаў за апошнім часам нашмат палепела, хаця большасць і не спяшаецца таго прызнаваць і скарыстоўваць.

У дыскусіі, што адбылася пасля, Уладзімір Мацкевіч зноў паставіў пад сумнеў выказванні сваіх апанентаў, паколькі праз іхныя

генералізацыі і спробы намаляваць тыповы вобраз беларускага інтэлектуала, гэны інтэлектуал менавіта знікае – і сам метадолаг асабіста не можа сябе там пазнаць і знайсці месца. Да таго ж ён прапанаваў разводзіць пазіцыю інтэлектуала і інтэлектуала патэнцыйнага, які яшчэ не самавызначыўся з уласным шляхам і разглядае сябе ў тыповых катэгорыях. Мацкевічу, у сваю чаргу, закінулі папрок у адсутнасці крытэраў для вызначэння асобы інтэлектуала, апрача суб'ектыўна-густоўных, а таксама агульны закід наконт «рэалізму» яго падыхода: маўляў, спачатку існуе інтэлектуал як жывая асоба і ён папярэднічае ўсім размовам наконт інтэлектуалаў і магчымым тыпалогіям ці нават робіць іх залішнімі. Апошняе Мацкевіч часткова прызнаў, праўда, акрэсліўшы сваю пазіцыю як «наміналістычную».

Пытанні і рэплікі з залі таксама імкнуліся ўдакладніць досыць цмяны прадмет маўлення і спрычыніць хаця-які кансэнсус філасофскіх пазіцыяў. Напрыклад, філосаф Леў Крывіцкі, якога Мацкевіч раней прывёў як прыклад беларускага інтэлектуала часоў перабудовы, прапанаваў вызначэнне інтэлектуала як «чалавека веры», які верыць у тое, што праз развіццё здумлення можа адбыцца грамадскі прагрэс, а таксама зазначыў надзённую патрэбу ў інтэлектуалах для будучага развіцця краіны, звярнуўшыся да прысутнай модадзі, чым зрэшты заслугаваў воплескаў залі.

Такім чынам, дыскусія, што адбылася ў межах прэзентацыі праграмы Лятучага ўніверсітэта, яшчэ кроць выявіла адсутнасць прынцыповай згоды наконт вызначэння асобы беларускага інтэлектуала, а таксама ягонага спосаба дзеяння, як і канстатацыю слабасці катэгорыі інтэлектуальнай супольнасці, яе несправўджанасці ў мысленні і дзеяннях саміх мясцовых інтэлектуалаў.

З відэазапісам дыскусіі можна пазнаёміцца тут: http://www.youtube.com/watch?v=6UjIGjS943I

Спецыяльна для часопіса *TOPAS*<br>агляд падрыхтаваў *Павел Баркоўскі*